ААВЛ

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка»

Репозиторий БГПУ

***А.А. Корзюк***

# ВЫВУЧЭННЕ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ КАНЦА XVIII – ПАЧАТКУ XX ст. У АГУЛЬНААДУКАЦЫЙНАЙ ШКОЛЕ

Рэкамендавана Вучэбна-метадычным аб'яднаннем
вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь па педагагічнай
адукацыі ў якасці вучэбна-метадычнага дапаможніка для студэнтаў
вышэйшых навучальных устаноў, якія навучаюцца па спецыяльнасцях:
1-020101 Гісторыя; 1-020102 Гісторыя. Дадатковая спецыяльнасць

Мінск 2010

БГПУ БИБЛИОТЕКА
ИНВ. № УК 4721

3. Параўнайце выказванні аб ролі нацыянальнай мовы ў жыц… народа, якія належаць генерал-губернатару М. Даўгарукаму і П. Шпілеўскаму па наступных крытэрыях: каму належыць выка… ванне; погляд аўтара на ролю мовы ў развіцці дзяржавы; адносін… аўтара да беларускай мовы. На падставе праведзенага параўнанн… зрабіце вывад.

*Генерал-губернатар **М.А. Далгарукаў** у 1833 г. у справазда… Мікалаю I аб кіраванні Віленскай і Гродзенскай губернямі і Бел… стоцкай вобласцю пісаў: «Ва ўсе часы, ва ўсіх краінах свету мов… заўжды была і будзе непасрэднай зброяй урадаў для дасягнен… ўсемагчымых відаў і намераў. Усюды пануючая мова дзяржав… як пануючае веравызнанне,... павінна мець перавагу перад мясц… вымі гаворкамі аддаленых, прыгранічных ці новадалучаных краі… Агульнае ўжыванне пануючай мовы ў дзяржаве непрыкметн… зблiжае разнародныя яе плямёны... і нарэшце злівае ўсе чужацкі… плямёны ў адзін народ»* [1, с. 48].

***П. Шпілеўскі** адзначаў: «Беларуская мова такая самастойная… паданні, павер'і і казкі яе такія арыгінальныя,... што... робіцца не… абходным даследаваць і адшукаць галоўны прыстанак старажыт… най рускай славяншчыны і пазнаёміцца выразна з першапачатк… вымі яе элементамі, што зберагліся ў Беларусі: вывучаючы бела… рускую мову, паданні, павер'і і казкі беларускага народа, мы вывучаем мову, паняцці і вераванні сваіх продкаў»* [1, с. 50].

4. Пра што сведчыла развіццё навуковых ведаў пра Беларусь у першай палове XIX ст.? Растлумачце прычынна-выніковую сувязь у ланцужку: далучэнне Беларусі да Расіі → зараджэнне беларусазнаўства.

Пасля заканчэння работы заслухоўваюцца паведамленні прадстаўнікоў кожнай групы. Абагульняючы адказы вучняў, настаўнік падкрэслівае, што сярод праблем, з якімі сутыкалася развіццё навуковых ведаў пра Беларусь і яе народ у гэты перыяд, было панаванне польскай мовы ў культурным жыцці; адсутнасць адзінай назвы народа і краіны; вызначэнне нацыянальнасці насельніцтва па рэлігійнай прыкмеце.

У выніку цэласнай характарыстыкі развіцця адукацыі і навукі ў Беларусі ў першай палове XIX ст. настаўнік падводзіць вучняў



…да разумення таго, што галоўнымі перашкодамі на шляху іх …лейшага развіцця ў гэты перыяд былі саслоўная абмежаванасць …тэмы адукацыі, палітыка русіфікацыі і панаванне польскай …мовы ў культурным жыцці.

На дом, акрамя адпаведнага параграфа, можна прапанаваць …обным вучням, у тым ліку схільным да вывучэння гісторыі, …дзяржальнае заданне: падрыхтаваць паведамленні пра жыццё і творчасць А. Міцкевіча, Я. Баршчэўскага, П. Багрыма і іншых выдатных дзеячаў літаратуры I паловы XIX ст. у адпаведнасці з вучэбнай праграмай.

**ЛІТАРАТУРА**


1. Сосна У.А., Марозава С.В., Паноў С.В. Гісторыя Беларусі (XIX ст. – 1917 г.): вучэб. дапам. для 8-га кл. устаноў, якія забяспечваюць атрыманне агул. сярэд. адукацыі, з бел. і рус. мовамі навучання з 12-гадовым тэрмінам навучання / пад рэд. М.С. Сташкевіча. Мінск, 2005.


## …5. Тэма «Літаратура і мастацтва ў першай палове XIX ст.»

На ўроку па гэтай тэме перад вучнямі стаіць важная задача – засвоіць важнейшыя рысы і асноўныя дасягненні ў развіцці беларускай літаратуры і мастацтва ў першай палове XIX ст. Яе паўнавартаснае ўспрыманне залежыць ад паспяховага развіцця ў вучняў навыкаў характарыстыкі дзеячаў культуры і іх твораў і з'яўляецца важным сродкам выхавання нацыянальнай годнасці і патрыятызму вучняў, а таксама іх эстэтычнай культуры і мастацкага густу.

Пры вывучэнні дадзенай тэмы мэтазгодна арганізаваць экскурсію для азнаямлення з мастацтвам Беларусі першай паловы XIX ст. у Нацыянальны мастацкі музей Беларусі, яго філіялы, мясцовыя краязнаўчыя ці мастацкія музеі. Паколькі здзейсніць падобную экскурсію непасрэдна на ўроку дастаткова цяжка па разнастайных прычынах, гэта можна зрабіць ў пазаўрочны час. Яшчэ адным варыянтам з'яўляецца правядзенне завочнай экскурсіі па адпаведнай экспазіцыі Нацыянальнага мастацкага музея падчас урока. У яе падрыхтоўцы настаўніку могуць аказаць дапамогу



Рэпазіторый БДПУ